Источник: "Навука" - 2018-03-26

# ГІСТОРЫЯ І СПАДЧЫНА



**«Беларуская Народная Рэспубліка: гісторыя і спадчына (да 100-годдзя абвяшчэння незалежнасці БНР)» – круглы стол пад такой назвай адбыўся 13 сакавіка ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі (ЦНБ).**

Ён быў арганізаваны рэдакцыяй «Беларускага гістарычнага часопіса» сумесна з ЦНБ. Да яго правядзення была прымеркаваная выстава, на якой прадстаўлены выданні дзеячаў БНР, навуковыя публікацыі, прысвечаныя яе гісторыі.

У пасяджэнні круглага стала прынялі ўдзел вядомыя беларускія гісторыкі: дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў Даніловіч, дырэктар Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Пётр Брыгадзін, дэкан гістарычнага факультэта БДУ Аляксандр Каханоўскі ды інш. Яны абмеркавалі канцэпцыі беларускай дзяржаўнасці на пачатку XX ст., геапалітычныя ўмовы і наступствы абвяшчэння незалежнасці БНР, уплыў Акта 25 сакавіка 1918 г. на гісторыю Беларусі.

У працэсе змястоўнай, цікавай і часам вострай дыскусіі ўдзельнікі круглага стала прыйшлі да высновы, што абвяшчэнне незалежнасці БНР 25 сакавіка 1918 г. стала вынікам імкнення беларускага народа да стварэння ўласнай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што ў складаных геапалітычных умовах БНР не была рэалізаваная, яе заснавальнікамі ўпершыню былі зроблены практычныя крокі наперад. Фактычна абвяшчэнне незалежнасці БНР стала важным этапам на шляху да станаўлення беларускай дзяржавы, які быў пройдзены праз стварэнне БССР да абвяшчэння незалежнай і суверэннай Рэспублікі Беларусь.

***Максім ГАЛЬПЯРОВІЧ,***
***галоўны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса»***